УДК 629.735

# Беларусы ў Казахстане

Лойка Т.В.
Белорусский национальный технический университет

90-я гады мінулага стагоддзя характэрызаваліся масавым ростам нацыянальнай самасвядомасці народаў на постсавецкай прасторы. Перасяленцы з былых савецкіх рэспублік пачалі ўспамінаць хто яны і адкуль і групіравацца ў розныя нацыянальныя суполкі. Не абмінуў гэты працэс і беларусаў Казахстана. Па перапісу 1999 г. беларусамі ў Казахстане назвалі сябе больш як 111 тыс. чалавек. Шмат хто з іх вызначыў свае беларускія карані ў другім ці нават ў трэцім пакаленні перасяленцаў. Як сведчыць гісторыя, перасяленні беларусаў у далекі Казахстан не заўседы былі добраахвотнымі. Казахстан у расійскай імперыі і ў савецкія часы быў месцам высылкі т.з. "небяспечных элементаў" і "ворагаў народа" з цэнтральных раенаў. Пачатак палажылі антырасійскія паўстанні 19 стагоддзя. Працягвалася гэта практыка ў 30-я гады савецкага перыяду. Падчас рэформы П.Сталыпіна тысячы малазямельных беларускіх сялян накіроўваліся ў паўночныя раены Казахстана. У перыяд індустрыялізацыі беларускія спецыялісты дапамагалі казахам узводзіць новыя прамысловыя аб'екты. У гады Вялікая Айчыннай вайны Казахстан стаў месцам эвакуацыі прамысловых прадпрыемстваў, шпіталяў, установў культуры. Але найбольш массавае перасяленне беларусаў у Казахстан было звязана з асваеннем у 50-я гады цалінных і залежных зямель. Тады на Усход, у тым ліку і у Казахстан выехала каля 60 тыс. беларусаў. Частка перасяленцаў вярталася на Радзіму, але шмат хто заставаўся назаўседы.

Многія выхадцы з Беларусі заставілі свой след ў гісторыі і культуры Казахстана. Сярод іх А.Янушкевіч, Б.Залескі, якія надрукавалі сваі нататкі аб быце, матэрыяльнай і духоўнай культуры насельніцтва казахскіх стэпаў. Працавалі настаўнікамі у мясцовых школах беларускі паэт К. Грыневіч, празаік С. Хурсік, а В. Радус-Зянковіч у 20-е гады ўзначальваў нават урад Казахстана. У пачатку 90-х гадоў у Астане, Алматы, Кустанаі, Паўладары і іншых гарадах ствараюцца беларускія асяродкі. Пры іх адкрываліся нядзельныя беларускія школы, ладзіліся беларускія святы, выставы, сустрэчы, святкаваліся юбілеі. У 2002 г. беларускія суполкі аб'ядналіся ў Асацыяцыю беларусаў Казахстана.

Сення Беларусь і Рэспубліка Казахстан – стратэгічныя партнеры. Паміж імі наладжаны цесныя сувязі ў розных галінах, у тым ліку і навуковыя кантакты БНТУ з ВНУ Казахстана. Немалая заслуга ў гэтым належыць нашым землякам, якія жывуць у гэтай краіне.